# «Фатаграфія — гэта лад жыцця». Вытрымкі з інтэрв’ю Уладзіміра Парфянка і фатаграфіі ягонага аўтарства



Фота: Данііл Парнюк.

*«Чорны дзень» для беларускай фатаграфіі»*, – менавіта так назвалі той час, калі стала вядома пра смерць беларускага фатографа, рэдактара, куратара **Уладзіміра Парфянка**. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнік вядомай галерэі візуальных мастацтваў NOVA памёр ва ўзросце 65 гадоў у Мінску. (Прычыны і дакладная дата смерці пакуль высвятляюцца). Гэта страта агаломшыла фатаграфічную і культурніцкую супольнаць, бо маштаб зробленага Уладзім Парфянком для беларускай фатаграфіі складана ўмясціць у адзін сказ. Толькі ў

бліжэйшых планах падзвіжніка было: адкрыццё дыскусійнага клуба «CLOUSE UP» пры Беларускім грамадскім аб’яднанні фатографаў, праца з архівамі, стварэнне кнігі па гісторыі беларускай фатаграфіі, распрацоўка канцэпцыі Музея беларускай фатаграфіі. Ён рыхтаваў і падкаст па гісторыі фатаграфіі… На жаль, гэтым планам не ўдалося здзейсніцца.

Reform.by сабраў вытрымкі з інтэрв’ю фатографа розных гадоў, а гэтаксама фатаграфіі яго вядомых праектаў. Гэта тая страта для беларускага мастацтва, якую пакуль немагчыма асэнсаваць.

**Фатаграфіі з серыі Persona non-grata**

«*Серию «Persona non grata» можно рассматривать как своеобразный коллективный портрет моих современников, не совместимых с той Системой, в они родились и в которой вынуждены продолжать жить. Как правило, это не случайные люди, а мои близкие друзья, хорошие знакомые и приятели, те, с кем меня сталкивала жизнь…»*, – распавядаў пра свой праект, які распачаў у 1988 годзе, Уладзімір Парфянок.






Уладзімір Парфянок. З серыі «Persona non grata». Незалежная асоба.




Уладзімір Парфянок. З серыі «Persona non grata». Беларускамоўны рок-гурт.






Уладзімір Парфянок. З серыі «Persona non grata». Афганец, перадавік вытворчасці.




Уладзімір Парфянок. З серыі «Persona non grata». Будучы мецэнат.






Уладзімір Парфянок. З серыі «Persona non grata». Малады фатограф і яго мадэль.

### Фатаграфіі з серыі «Фрагменты быцця»

«Работы *конца 1980-х годов во многом тяготели к так называемой «прямой фотографии». Мы постигали навыки фотографического ремесла, охотясь за проявлениями реальной жизни. Люди на улицах городов были открыты и неагрессивны. Человек с фотокамерой был едва ли не неотъемлемым атрибутом городского ландшафта. Съемка на улице приносила невероятное удовольствие.*

*Это было время расцвета субъективной фотодокументалистики – в пику вымученности и постановочности сцен газетных фоторепортажей. Съемка изнутри события, полное растворение фотографа в снимаемой ситуации считались вершиной фотографического пилотажа».*






Уладзімір Парфянок. З серыі «Фрагменты быцця». Гарадская эротыка (3). Мінск.




Уладзімір Парфянок. З серыі «Фрагменты быцця». Малая форма. Мінск.






Уладзімір Парфянок. З серыі «Фрагменты быцця». Успаміны, якія нахлынулі. Мінск.




Уладзімір Парфянок. З серыі «Фрагменты быцця». Гарадская эротыка(2). Мінск






Уладзімір Парфянок. З серыі «Фрагменты быцця». Нефармальнае свята. Мінск.

## Фатаграфіі з серыі «Сад камянёў»

*«Серия работ «Сад камней», созданная на протяжении 1991 года во время разных поездок по большой советской стране (Ялта, Одесса, Чебоксары, Калининград, Москва), представляет собой коллекцию «вымирающих» образцов массовой пропаганды — анонимных скультурных композиций (часто с аллегорическим подтекстом), изготовленных из гипса. Разбросанные в тысячах копий по паркам, дворам и скверам разных городов, они до сих пор продолжают влачить жалкое существование, демонстрируя своим полуразрушенным состоянием незыблемость советских мифов».*





Уладзімір Парфянок. З серыі «Сад камянёў».



Уладзімір Парфянок. З серыі «Сад камянёў».





Уладзімір Парфянок. З серыі «Сад камянёў».



Уладзімір Парфянок. З серыі «Сад камянёў».

## Фатаграфіі з серыі «Lucida momenta»

Уладзіміра Парфянок пра серыю: *«Выставочный проект «Lucida momenta» (1995) включил в себя фотографии, сознательно сделанные вне фокуса. Размытые, нерезкие фотоснимки крупных фрагментов различных предметов были соединены в большие «композиты», «табло», иногда – в секвенции, что придало малоинформационным изображениям дополнительную нарративность».*




Уладзімір Парфянок. З праекта Lucida Momenta. Без назвы. Кампазіт з 9 таніраваных фатаграфій.




Уладзімір Парфянок. «Lucida momenta» Секвенцыя з 8 фатаграфій.

## Вытрымка з інтэрв’ю часопісу pARTisan, студзень 2014 года:

Уладзімір Парфянок: «Для *мяне фатаграфія — гэта лад жыцьця. Не гульня ў жыцьцё, а менавіта сама ягоная форма. Што б я ні рабіў, — гэта фатаграфія ў рознай форме яе праявы».*

**З інтэрв’ю для кнігі «Гісторыя беларускай фатаграфіі», ліпень 2019 года:**

*«Усё складвалася само сабой. Быў такі ландшафт культурных падзей, прагалы якога натуральным чынам неяк імкнешся запоўніць. Але канчаткова вымаўлёваецца пэўны «сіндром Юрыя Васільева» — калі свой імпэт, час і сілы траціш на грамадскія справы і ў выніку грэбуеш сваёй уласнай творчасцю. Ды і жадання зарабіць на актыўнасцях не было. Хутчэй рухала ідэя быць у працэсе, і гэты працэс падтрымліваць усімі даступнымі сродкамі»*.

**З інтэрв’ю газеце «Культура», люты 2019 года:**

*«Тая архіўная ліхаманка, што распачалася ў апошнія гады — вельмі добры знак. Бо менавіта архівы паказваюць той аб’ём, глыбіню і гістарычную перспектыву, якой раней мы былі пазбаўлены ў дачыненні да фатаграфіі. Яны раскрываюць магчымасці фота як сродку нацыянальнай ідэнтыфікацыі, — акурат тое, пра што я казаў. Людзі паступова пачынаюць усведамляць гэта, бо раней многія фотамастакі меркавалі, нібы гісторыя пачынаецца з іх. А тут высвятляецца, што нягледзячы на ўсе жыццёвыя перыпетыі і катастрофы XX стагоддзя, заўсёды былі людзі, якія здымалі, і здымалі таленавіта. Той жа архіў* ***Таранды*** *адкрыў нам Заходнюю Беларусь 1950-х, або архіў* ***Савы Сіўко****, які паказаў міжваенны час Любчанскага краю. І калі мы знойдзем тое, што пакуль нераскрыта, невядома,— а я ўпэўнены, што гэтыя аўтары ёсць і чакаюць свайго часу ды прызнання, — мы з асобных пункціраў атрымаем суцэльную лінію— карціну нашай нацыі, яе гістарычны партрэт. Безумоўна, такім чынам можа скласціся і экспазіцыя Музея фатаграфіі»*.

*«Як бы пафасна гэта ні гучала, беларускай фатаграфіі сёння патрэбна проста ўвага. Ды на высокім узроўні. Бо фатаграфія як была гэткай «падчаркай» сярод іншых відаў мастацтваў, так і засталася. Нягледзячь. Месяц фатаграфіі ў Мінску, ці, скажам, наяўнасць асобнай намінацыі ў*

*Месяц фатаграфіі у Мінску, ці, скажам, пайунасць асобнай намінацыі у Нацыянальнай мастацкай прэміі.*

**— Для вас гэта не аргументы?**

*— Так. Бо многія ініцыятывы ў нас робяцца хутчэй насуперак, а не дзякуючы. Дзеля таго, каб убачыць рэальны стан рэчаў, дастаткова проста паглядзець на досвед суседніх краін у гэтай вобласці. У Маскве, скажам, працуе Мультымедыя Арт Музей, у якім фатаграфія мае свой сталы дом. У Літве яшчэ ў савецкія часы на фатаграфію і баскетбол зрабілі стаўку — і сёння гэта прызнаныя брэнды краіны. У Польшчы праходзяць розныя фотафестывалі, нават працуе аўкцыён польскай фатаграфіі… Ва Украіне адкрываюцца галерэі, ладзяцца шматлікія падзеі. Можа быць, у іх няма такога буйнога фестывалю, як у нас, але затое ўкраінцы не першы год робяць друкаваны часопіс, прысвечаны фатаграфіі. А ў нас ці ёсць падобнае выданне?*

*Гэта ўсё разам стварае асяродак, аснову для далейшага развіцця фатаграфічнай практыкі. Давайце будзем шчырымі: у параўнанні з гэтымі прыкладамі намаганні нашых энтузіястаў — гэта не той узровень. У нашай краіне фатаграфія да гэтай пары не атрымала належнай падтрымкі — пра што сведчыць хаця б адсутнасць нацыянальнага фатаграфічнага музея або галерэі».*

**З інтэрв’ю парталу Kyky.org, жнівень 2011 года:**

«Если вы являетесь носителем беларусской ментальности, то априорно в вашей фотографии это можно будет почувствовать. Беларусская фотография отличается и от украинской, и от российской. Вспоминаю выставку 1994 года в Москве «Искусство современной фотографии. Россия. Украина. Беларусь», в ней были отведены по залу на каждую из стран-участниц выставки. И переходя из зала в зал, можно было заметить, как фотографии отличаются по настроению и темпераменту. Беларусская фотография мягкая, медитативная, в ней нет истеричности и крикливости».

«Фотография — это искусство случайного».

***

Уладзімір Парфянок нарадзіўся ў 1958 годзе ў мястэчку Вострына Гродзенскай вобласці. У фатаграфію прыйшоў у 1980-я. Адзін са слухачоў “Студыі-3” пры фотаклубе “Мінск”, ён патрапіў у эпіцэнтр творчага асяродку, створанага культавым педагогам і фатографам **Валерыем Лабко**. Адсюль, са “Студыі-3”, фатограф бярэ творчую свабоду і прагу да эксперыментаў, а таксама любоў да фатаграфіі як інструменту самаідэнтыфікацыі і пошуку. Прадстаўнік «новай хвалі» беларускай фатаграфіі ў 1980-х – 1990-х. Адзін з заснавальнікаў і куратар Галерэі візуальных мастацтваў NOVA. Рэдактар, выкладчык, культурніцкі дзеяч.

Працы Уладзіміра Парфянка знаходзяцца ў калекцыях Museet for Fotokunst «Brandts Klaedefabrik» (Данія),  Det Kongelige Bibliotek (Данія), Інстытута імя Гёте (Балгарыя), ef-Galeria (Польшча), Дзяржаўнага музейна-выставачнага цэнтра Росфота (Расія), Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Нацыянальнага мастацкага музея РБ, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў РБ ды іншых прыватных зборах Беларусі, Расіі, Даніі, Фінляндыі, Германіі, Бельгіі, Францыі.

🔥 **Мы будем благодарны за поддержку нашей работы донатом.**

16.01.2024 00:48

ПРЕДЫДУЩАЯ
« Григория Костусева перевели на тюремный режим

СЛЕДУЮЩАЯ
Правительство назначило представителей государства в крупных предприятиях »

ПОСЛЕДНИЕ НОВОСТИ




Новости

В пяти городах Беларуси пройдет